# КАМПАРАТЫВІЗМ У СУЧАСНЫМ ТЭАТРАЗНАЎСТВЕ (ДА ПЫТАННЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ТЭАТРАЛЬНЫХ ЗБУДАВАННЯЎ І СЦЭНАГРАФІІ БЕЛАРУСІ XVI — ПАЧ. XX СТ.)

**Пагоцкая А. В.,**
**выкладчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Кампаратыўныя метады ў мастацтвазнаўстве выкарыстоўваюцца на другім узроўні даследавання пасля эмпірычнага, калі адбываецца супастаўленне, параўнальны аналіз ужо апісаных з'яў, выяўленне агульнага і асаблівага. З дапамогай гэтых метадаў можна знайсці сутнасныя характарыстыкі мастацтва, яго непаўторныя рысы. Разам з тым параўнальны аналіз дазваляе раскрываць агульныя заканамернасці развіцця мастацтва, якія даследуюцца потым з дапамогай такіх метадаў, як структурна-функцыянальны, фактарны і кампанентны аналіз, мадэляванне і г. д.

Кампаратыўныя даследаванні, якія разглядаюць з'явы ці працэсы ў шырокім гістарычным і культурным кантэксце, у сучасным тэатразнаўстве маюць на ўвазе ўсебаковы аналіз перадумоў і вынікаў, прыцягненне гістарычных аналогій, вывучэнне вопыту іншых краін. У вывучэнні тэатра як віду мастацтва выкарыстоўваюцца такія раздзелы кампаратыўных даследаванняў, як бінарны аналіз, параўнанне падобных і кантрастных з'яў, асінхроннае параўнанне, планетарнае ці глабальнае даследаванне [1, с. 28-29].

У адрозненне ад тэорыі мастацтва кампаратывістыка мае на ўвазе канкрэтныя творы, улічваючы прасторавыя і часавыя параметры з'яў мастацтва, што калі не вызначае, то прадугледжвае перакрыжаванае вывучэнне асобных твораў. У якасці кампанентаў для вывучэння тэатразнаўства прапануе тэатральную прастору, тэатральнае збудаванне, тэатральны твор, драматургію, дэкарацыйнае мастацтва (касцюм, грым), музычнае афармленне спектакля, тэхнічныя сродкі сцэны і спектакля (машынерыя, святло, гукашумавое афармленне). Зразумела, недастатковым у тэатразнаўстве будзе вывучэнне і параўнанне толькі асобных матэрыяльных кампанентаў. Значную ролю адыгрываюць і такія катэгорыі, як цэласнасць мастацкага твора, акцёрскае майстэрства, стварэнне асяроддзя дзеяння, характар часу дзеяння і музыкальнага настрою, характар дзеючых персанажаў, дынаміка развіцця дзеяння, цэласнасць спектакля.

Тэатр — з'ява калектыўная, таму пры вывучэнні любога тэатральнага твора аб'ектам даследавання з'яўляецца калектыў аўтараў і кожны ствральнік паасобку. З пункту гледжання кампаратывізму ў адносінах да аўтара можна разглядаць іншыя творы і жыццёвы шлях у якасці асновы для паглыбленага разумення драматычнага твора.

Тэатр з'яўляецца сінтэтычным па форме і сінкрэтычным па зместу відам мастацтва. Сінтэтызм сцэнічнага мастацтва заключаецца ва ўплыве на тэатр такіх мастацтваў, як архітэктура, скульптура, жывапіс, музыка, літаратура і ўсе іх састаўныя часткі, якія праяўляюцца на працягу ўсяго працэсу ад падрыхтоўкі да выхаду спектакля. Яны ўваходзяць у спектакль у форме драматургіі, музычнага афармлення, тэатральнай архітэктуры, дэкарацыйнага мастацтва. Яшчэ адным момантам праяўлення сінтэзу з'яўляецца выкарыстанне падчас тэатральнага прадстаўлення тэхнічных сродкаў, якія значна ўплываюць на дынаміку спектакля.

Пры вывучэнні тых ці іншых тэатральных збудаванняў і сцэнаграфіі неабходна мець на ўвазе тэматычныя, жанравыя, эстэтычныя, гістарычныя і іншыя аспекты. Але ж гэта не азначае, што кампаратывістыка вывучае толькі праблемы ўплыву. З гэтага пункту гледжання можна выдзеліць некаторыя метады даследавання, якія выкарыстоўваюцца ў кампаратыўным мастацтвазнаўстве: аналіз твораў, высвятленне элементаў інтэртэкстуальнасці, вывучэнне працэсаў асіміляцыі і трансфармацыі, аналіз гістарычнага развіцця жанравых катэгорый, эстэтычных сувязяў паміж рознымі відамі мастацтва ў кожнай асобнай краіне ці рэгіёне і ва ўзаемаўплывах паміж імі.

Магчымасць кампаратыўнага аналізу спрашчаецца храналагічнай блізкасцю твораў мастацтва (старажытнагрэчаскія і старажытнарымскія тэатры; тэатр Агінскага ў Слоніме і тэатр у Лазенках у Варшаве). Але такі ж падыход можа прымяняцца і да твораў, якія стаяць далёка адзін ад аднаго ў часе. Да таго ж у тэатразнаўстве можна праводзіць паралелі паміж тэатрам і жывапісам, тэатрам і музыкай, тэатрам і літаратурай і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не залішнім становіцца і вывучэнне некаторых фактараў, якія ўплываюць на развіццё мастацтва тэатра ў розныя часы: сацыялагічны (якім чынам да тэатра адносіліся розныя сацыяльныя групы ў тую ці іншую эпоху, якія формы тэатра і як існавалі ў тым ці іншым сацыяльным асяроддзі), мастацка-практычны (як розныя ці падобныя літаратурныя сюжэты ўвасабляюцца ў драматургіі), тэарэтычны (вывучэнне падабенства і адрозненняў у пастаноўках, збудаваннях, афармленні у розных краінах і рэгіёнах).

Адзін з напрамкаў кампаратывістыкі — супастаўленне крытычнай думкі, эстэтычнай тэорыі ў розных відах мастацтва. Да яго, напрыклад, можна аднесці кампаратыўныя даследаванні архітэктурных і тэатральных прынцыпаў дзеячаў эпохі Адраджэння С. Сэрліа, А. Паладыа і інш. Другі — аналіз функцыянавання і семіятычнага сэнсу мастацкіх твораў. Гэта, напрыклад, транспазіцыя сюжэта з драматургіі (літаратуры) на сцэну, г. зн. працэс стварэння спектакля з п'есы, інсцэніроўка.

Вядома, умовай паспяховага развіцця любой краіны з'яўляецца захаванне асабістай нацыянальна-культурнай дамінанты. Таму перспектыўнымі напрамкамі кампаратывістыкі ў тэатразнаўстве лічацца даследаванні мастацкіх напрамкаў і стыляў. Па-першае, гэта можа быць параўнальны, супастаўляльны аналіз тэатральнай практыкі і драматургіі розных краін і рэгіёнаў (Беларусі, Расіі і Еўропы; пабудова англійскага і іспанскага тэатра эпохі Адраджэння; творы Мальера на сцэне Радзівілаўскага тэатра ў Нясвіжы). Па-другое, вывучэнне розных напрамкаў у межах аднаго стылю ці эпохі (ранні, сталы, позні класіцызм, ампір), ці параўнальны аналіз розных стыляў і эпох (рэнесанс, барока, ракако, класіцызм).

Кампаратыўнае мастацтвазнаўства — дысцыпліна, у межах якой найбольш поўна можна даследаваць феномен глабалізацыі ў мастацтве: супярэчнасць паміж глабальным і лакальным, якую магчыма і неабходна вывучаць на інтэрнацыянальным, міжрэгіянальным і міжкультурным узроўні.

### ЛІТАРАТУРА

1. Европейские чтения: введение в практику сравнительного литературоведения Ж. Л. Акетта // Реферативный журнал. М., 2005. Серия 7. № 4.

***Pahotskaya A. V.***

*COMPARATIVISM IN MODERN THEATER SCIENCE (TO THE QUESTION OF RESEARCH OF THEATRE BUILDINGS AND SCENOGRAPHY OF BELARUS IN 16-19 CENTURIES)*

*Comparative method — one of the most popular in modem science. It means the all-round analysis of the phenomena of art, comparison of well-known and new processes and events. This is especially actual for research of theatre which is a synthetic art. So we can consider and compare different sides of theatre art: screenplays, music, architecture of theatre, decorations, costumes, make-up, art of the actors, work of director etc.*

## ОСНОВНЫЕ ЧЕРТЫ ДИРИЖЕРСКО-ХОРОВОГО ОБРАЗОВАНИЯ БЕЛАРУСИ НА РУБЕЖЕ XIX-XX В.

**Герасимович С. С.,**
**старший преподаватель кафедры хорового дирижирования Белорусской государственной академии музыки**

Отечественное дирижерско-хоровое образование на рубеже XIX-XX в. развивалось в двух направлениях: обучение учителей церковного пения и подготовка регентов самодеятельных и церковных хоров. Формирование учительских кадров по церковному пению для учебных заведений и регентов для церковных и светских хоров на территории Беларуси сосредоточивалось в светских (5 учительских семинариях, 2 учительских институтах) и духовных (11 училищах, 4 семинариях) учебных заведениях. Дирижерско-хоровое образование в них имело общие черты и являлось составной частью общего образовательного процесса данных учебных заведений. Специализированно подготовкой учителей церковного пения и регентов занимались на летних педагогических и регентских курсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ